***Антановіч Н. М.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.***, *начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Працяг. Пачатак гл. № 9—12 за 2022 г., № 1 за 2023 г.*

## СЛОВА

### Урок* 68. Аналіз кантрольнай работы. Значэнне слова

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уменне выконваць работу над памылкамі; фарміраваць уяўленне пра слова як адзінку мовы, пра лексічнае значэнне слова; фарміраваць уменне вызначаць слова па яго лексічным значэнні, тлумачыць значэнне слоў з апорай на кантэкст, вызначаць у тэксце невядомыя словы; удасканальваць уменне тлумачыць правапіс слоў; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць паважлівыя адносіны да бабулі.

***Абсталяванне:*** фотаздымак, на якім адлюстраваны кросны; беларускія льняныя ручнікі; вышываныя ручнікі або фотаздымкі з вышыванымі ручнікамі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап правядзення аналізу кантрольнай работы.**

Пасля паведамлення вынікаў выканання кантрольнай работы вучні ў сшытках для кантрольных работ робяць запіс «Работа над памылкамі». Настаўнік тлумачыць парадак работы з дапушчанымі памылкамі. Вучні выпісваюць словы, у якіх былі дапушчаны памылкі, на дошцы і ў сшытках. На дошцы працуюць вучні з ліку тых, хто памылак не зрабіў. У працэсе выканання работы над памылкамі навучэнцы могуць карыстацца форзацам 2 вучэбнага дапаможніка.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Адзін вучань чытае ўслых праблемную сітуацыю на с. 86 вучэбнага дапаможніка. З апорай на веды з І класа вучні выказваюць свае меркаванні наконт таго, для чаго патрэбны словы. Варта, каб яны ўспомнілі, што словы і прадметы — гэта не адно і тое ж; што ёсць словы назвы прыметаў, іх прымет і дзеянняў.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік аб'яўляе тэму ўрока: «Значэнне слова».

— Як вы думаеце, пра што вы даведаецеся на ўроку? Чаму навучыцеся?

***Практыкаванне 115.***

Выкананне практыкавання арганізуецца франтальна. Вучні называюць кожнае слова па яго лексічным значэнні: акварыум, бібліятэка, малявацъ, метро, цікавы.

— Якія з названых слоў з'яўляюцца слоўнікавымі? *(Акварыум, бібліятэка, метро.)* На якое пытанне адказваюць гэтыя словы і што абазначаюць? *(Што? Прадмет.)* Якое з «расшыфраваных» слоў абазначае прымету прадмета? *(Цікавы.)* Што можа быць цікавым? Пастаўце пытанне да слова *цікавы*. На якое пытанне адказвае слова, якое яшчэ не назвалі? *(Што рабіць? Маляваць.)*

Вучні ўстанаўліваюць алфавітны парадак «расшыфраваных» слоў. Два вучні запісваюць іх у алфавітным парадку з адваротнага боку дошкі, астатнія — у сшытках. Праводзіцца ўзаемаправерка выкананага задання.

Завяршаецца выкананне практыкавання вывадам, які павінны зрабіць вучні, адказваючы на пытанне «Для чаго патрэбныя словы?».

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 87) і вызначаюць, ці правільны вывад яны зрабілі.

***Практыкаванне 116.***

Вучні чытаюць словы, тлумачаць іх значэнні, а таксама правапіс слоў *метро* і *грэчка*.

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.

Затым вучні вызначаюць, хто будзе выконваць заданне «пілота», а хто — «касманаўта». Адзін «пілот» і адзін «касманаўт» выконваюць заданне ў адпаведнасці з умовай практыкавання і запісваюць словы з адваротнага боку дошкі. Астатнія вучні працуюць у сшытках.

Запіс у «пілотаў»: *метр, лён, рэчка, леў*; запіс у «касманаўтаў»: *рукаў, крама (прама), плуг, смех.*

Вучні, якія працавалі каля дошкі, тлумачаць значэнне слоў, якія запісалі.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 117.***

Пасля прачытання тэксту вучні расказваюць, пра што новае яны даведаліся, удакладняюць значэнне слоў *ткацтва, попел* у тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка. Настаўнік дэманструе фотаздымкі, на якіх адлюстраваны кросны.

Узнаўленне зместу тэксту можна сумясціць з гутаркай па пытаннях:

— Калі з'явіліся беларускія ручнікі? Якія ніткі выкарыстоўвалі для ручнікоў? Раскажыце, як адбельвалі ручнікі. Дакажыце, што гэта была цяжкая работа.

Дадаткова настаўнік можа расказаць, што беларускія льняныя ручнікі прыгожыя і якасныя, яны карыстаюцца папулярнасцю не толькі ў нашай краіне. Настаўнік паказвае сучасныя льняныя ручнікі.

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. Вучань, які тлумачыць правапіс слова, запісвае яго на дошцы. Астатнія вучні — у сшытках. *(Беларускія, стагоддзяў, ільняных, спецыяльных, драўляных, шэрага, гарачай, у вадзе.)*

***Практыкаванне 118.***

Вучні разглядаюць малюнак, апісваюць пеўніка.

*Магчымы варыянт апісання.* Вышыты на ручніку пеўнік вельмі прыгожы. У яго чырвоны грэбень. Пер'е рознакаляровае: зялёнае, жоўтае, ружовае, фіялетавае, чорнае. Ён выглядае вельмі паважным.

Настаўнік чытае верш. Пасля праслухоўвання верша вучні ўдакладняюць значэнне слова *кволы* ў тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка; знаходзяць у вершы радкі, якія пацвярджаюць, што дзяўчынка з пяшчотай ставіцца да бабулі.

— Ці бачылі вы калі-небудзь вышываныя ручнікі? Дзе бачылі? Што было адлюстравана на ручніках?

Настаўнік можа прадэманстраваць вышываныя ручнікі (фотаздымкі з вышыванымі ручнікамі) і прапанаваць вучням расказаць, што на іх вышыта.

Кожны вучань вызначае, заданне «пілота» ці «касманаўта» будзе выконваць. Затым вучні працуюць самастойна. Праводзіцца франтальная праверка выкананага задання. («Пілоты»: *унучка, бабуля*; «касманаўты»: *заглядзелася, гладзіць, пазнала*.)

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 89, практ. 119. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што загадку трэба запісаць у слупок.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Вучні вяртаюцца да праблемнага пытання на с. 86 і адказваюць на яго.

## Урок 69. Знаёмства з тлумачальным слоўнікам

***Мэты ўрока:*** пазнаёміць з тлумачальным слоўнікам; фарміраваць уменне карыстацца ім, тлумачыць значэнне слова з апорай на тлумачальны слоўнік; удасканальваць уменне падбіраць да тэксту загаловак, вызначаць тэму тэксту, тлумачыць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі на вывучаныя правілы; адпрацоўваць вымаўленчыя навыкі, уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку; пазнаёміць са слоўнікавымі словамі *Рэспубліка Беларусь*; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі адзення; развіваць арфаграфічную пільнасць, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць любоў да роднага краю.

***Абсталяванне:*** тлумачальныя слоўнікі (пажадана адзін на кожную парту, адзін для выставы слоўнікаў); руска-беларускі слоўнік; беларуска-рускі слоўнік; арфаграфічны слоўнік; ільняное семя; фотаздымкі, на якіх адлюстраваны льняное поле, церніца;

карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 119.***

Вучні чытаюць загадку і называюць адгадку. *(Прас.)*

— Якія словы ў загадцы падказалі вам адгадку? *(...складкі разгладзіць стараецца...)*

Вучні тлумачаць значэнне слова *кашуля*. Можна звярнуць увагу на кашулі хлопчыкаў у класе.

— У якім слоўніку можна ўдакладніць напісанне слова *прас*? *(У арфаграфічным слоўніку.)* Якімі слоўнікамі вы карысталіся яшчэ? *(Руска-беларускім, беларуска-рускім слоўнікамі.)* (Настаўнік задае пытанне пра іншыя слоўнікі, акрамя арфаграфічнага, у тым выпадку, калі на ўроках вучні знаёміліся і працавалі з гэтымі слоўнікамі.) Ці ведаеце вы, у якім слоўніку можна ўдакладніць значэнне слова?

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Адзін вучань чытае ўслых праблемную сітуацыю на с. 89 вучэбнага дапаможніка.

— Ці ведаеце вы значэнне слова *зацірка*? Ці каштавалі вы калі-небудзь зацірку? Да якога слоўніка трэба звярнуцца, каб даведацца пра значэнне слова?

Настаўнік прапануе вучням самастойна знайсці адказ на пытанне ў рубрыцы «Трэба ведаць» на с. 90 вучэбнага дапаможніка і адшукаць тлумачальны слоўнік сярод іншых слоўнікаў (руска-беларускі, беларуска-рускі, арфаграфічны, тлумачальны) на арганізаванай настаўнікам выставе слоўнікаў.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе тэму ўрока: «Знаёмства з тлумачальным слоўнікам». Вучні фармулююць мэты ўрока.

Настаўнік знаёміць вучняў з будовай тлумачальнага слоўніка, прапануе пагартаць яго і зрабіць вывад, у якой паслядоўнасці размешчаны ў ім словы. *(У алфавітным парадку.)*

Вучні знаходзяць у тлумачальным слоўніку слова *зацірка* і чытаюць яго значэнне.

***Практыкаванне 120.***

Спачатку вучні чытаюць тэкст самастойна, затым па ролях; расказваюць, што выклікала ў іх усмешку.

— Пра што расказваецца ў тэксце? Што такое крупнік? *(Гэта крупяны суп.)* (Вучні ўдакладняюць значэнне слова *крупнік* у тлумачальным слоўніку.) Ці каштавалі вы калі-небудзь крупнік?

— Падбярыце да тэксту загаловак.

Вучні тлумачаць значэнне выдзеленых слоў (*матляць, парушаць*), правяраюць правільнасць сваіх меркаванняў з дапамогай тлумачальнага слоўніка.

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна: вучні каменціруюць напісанне слоў і запісваюць іх у сшытак. *(Галавой, катлетку, маўчаць, цішыню, апельсінчык.)* Узор каменціравання: «Вымаўляю слова — [галавой]. Вызначаю націскны склад у слове: націск падае на трэці склад — [вой]. Не пад націскам у першым і другім складах пішу літару ***а***».

— Паразважайце, які мог быць працяг размовы мамы з дачкой. Разыграйце гэту размову.

***Практыкаванне 121.***

Настаўнік чытае верш. Праводзіцца абмеркаванне зместу верша па пытаннях:

— Пра што расказваецца ў вершы? Як вы разумееце значэнне слова *скарб*? Чаму аўтар называе льняное семя скарбам? (Настаўнік прапануе вучням разгледзець ільняное семя.) Ці згодны вы з аўтарам? Чаму? З чым аўтар параўноўвае ручнікі? Як вы думаеце чаму?

Вучні тлумачаць значэнне выдзеленых слоў, знаходзяць адпаведныя прадметы на фотаздымку. (*Абру́с* — кавалак тканіны спецыяльнага вырабу, якім засцілаюць стол; *чапе́ц* — лёгкі галаўны ўбор у выглядзе шапачкі, які раней насілі замужнія жанчыны; *кашу́ля* — сарочка, рубашка; *фарту́х* — жаночая адзежа пэўнага крою, якую надзяваюць спераду на сукенку, спадніцу, каб не забрудзіць іх; *ручнік* — вузкі прадаўгаваты кавалак тканіны, спецыяльна прызначаны для выцірання твару, рук, цела ці пасуды.) Арганізуецца ўдакладненне значэння слоў па тлумачальным слоўніку.

Выкананне пісьмовага задання можна правесці па-рознаму. Калі на ўроку на кожнай парце будзе тлумачальны слоўнік, вучні самастойна вызначаюць слова, тлумачэнне значэння якога яны будуць выпісваць. У тым выпадку, калі ў класе толькі адзін або некалькі тлумачальных слоўнікаў, можна калектыўна вызначыць слова, значэнне якога вучні запішуць. Пры гэтым праводзіцца каменціраванае пісьмо.

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік прапануе вучням скласці назву краіны са складоў, «рассыпаных» на дошцы:

| | | | |
|---|---|---|---|
| ка | спу | ла | |
| блі | Бе | русь | Рэ |

— Назавіце сталіцу Рэспублікі Беларусь. Людзі якіх нацыянальнасцей жывуць у нашай краіне? Якія ў нас дзяржаўныя мовы?

Вучні вымаўляюць назву краіны, вылучаюць націскны склад у кожным слове. У слове *Рэспубліка* націск падае на другі склад, у слове *Беларусь* — на трэці склад.

Настаўнік прапануе вучням знайсці назву нашай краіны на форзацы вучэбнага дапаможніка.

— У якім слове і на якіх літарах зроблены малюнак? Як вы думаеце, чаму вылучаны менавіта гэтыя літары? *(Слова «Рэспубліка» трэба пісаць з вялікай літары, не пад націскам у гэтым слове захоўваецца літара **э**.)* Які малюнак зроблены на спалучэнні літар ***Рэ***? *(Карта Рэспублікі Беларусь, побач валошкі і каласкі.)* Ці адпавядае напісанне слова *Беларусь* правілам? Раскажыце, якім.

Вучні запісваюць у сшытак назву краіны — *Рэспубліка Беларусь*, ставяць націск у кожным слове, падкрэсліваюць спалучэнне літар ***Рэ***.

— Прадоўжыце сказ і запішыце яго: «Наша Радзіма — ... ... ».

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 122.***

Вучні тлумачаць значэнне слоў *адзенне*, *герб*, *стра́вы*, *краіна*, *ле́кі*, карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, затым чытаюць тэкст і дапаўняюць яго гэтымі словамі. Абмеркаванне зместу тэксту можна арганізаваць з выкарыстаннем пытанняў:

— Пра што расказваецца ў тэксце? Дзе можна ўбачыць кветкі лёну? Чаму гэту расліну цэняць у нашай краіне?

— Прыдумайце загаловак да тэксту. На што ён указвае: на тэму ці асноўную думку?

Настаўнік можа прапанаваць апісаць кветку льну з апорай на малюнак у вучэбным дапаможніку, дадаткова падабраць фотаздымкі, на якіх адлюстравана льняное поле.

Тлумачэнне правапісу слоў на вывучаныя правілы праводзіцца франтальна.

Вучні ўспамінаюць алгарытм пісьма пад дыктоўку. Другую частку тэксту запісваюць пад дыктоўку настаўніка, пасля чаго робяць узаемаправерку.

***Практыкаванне 123.***

Вучні чытаюць і адгадваюць загадку. Дапаўняюць прапанаваныя ў практыкаванні скорагаворкі словам *лён*. Вылучаюць словы, значэнне якіх ім не вядома, з дапамогай тлумачальнага слоўніка высвятляюць іх значэнне. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на значэнне слова *церніца*. Можна дадаткова падабраць фотаздымак, на якім адлюстравана гэта прылада.

Вучні вызначаюць, скорагаворку «пілота» ці «касманаўта» будуць вучыцца правільна і хутка вымаўляць. Адпрацоўка вымаўлення скорагаворак спачатку праводзіцца ў парах, пасля чаго некалькі вучняў дэманструюць узор правільнага вымаўлення. Можна арганізаваць конкурс на лепшага чытача скорагаворкі сярод «касманаўтаў» і «пілотаў».

Кожны вучань самастойна запісвае ў сшытак скорагаворку, якую выбраў. Затым праводзіцца тлумачэнне правапісу слоў на вядомыя правілы.

***Самастойнае выкананне задання на картках.*** Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем.

Віка выпісала з тэксту словы, значэнне якіх не ведала. Злучыце кожнае слова з яго значэннем.

| | |
|---|---|
| бярозавік | тлушч з расліннага насення |
| кнігарня | бярозавы сок |
| алей | кніга з тэкстамі для практыкавання ў чытанні |
| чытанка | кніжны магазін |

Да якога слоўніка вы параіце звярнуцца дзяўчынцы, каб удакладніць значэнне слоў? Адзначце [+] правільны адказ.




☐ ☐ ☐ ☐

Пасля выканання задання праводзіцца франтальная праверка. Пры неабходнасці вучні ўдакладняюць значэнне слоў у тлумачальным слоўніку.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 93, практ. 124. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што першую скорагаворку трэба запісаць у слупок (як у вучэбным дапаможніку).

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— У якім слоўніку можна ўдакладніць значэнне слова? Ці можна даведацца пра напісанне слова, карыстаючыся тлумачальным слоўнікам? Адказ аргументуйце.

— Якія новыя словы вы пачулі на ўроку? Што яны абазначаюць?

## Урок 70. Словы з адным і некалькімі значэннямі

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уяўленне пра адназначныя і мнагазначныя словы; фарміраваць уменне вызначаць значэнне слова з апорай на кантэкст, вызначаць словы, якія маюць адно і некалькі значэнняў; уменне карыстацца тлумачальным слоўнікам; удасканальваць уменне тлумачыць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі на вывучаныя правілы; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі транспартных сродкаў, устойлівымі выразамі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; паўтарыць правілы бяспечных паводзін у грамадскім транспарце.

***Абсталяванне:*** тлумачальны слоўнік; карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 124.***

Вучні чытаюць скорагаворкі, тлумачаць значэнне слоў *мандаліна*, *раяль*, паказваюць адпаведныя прадметы на малюнку ў вучэбным дапаможніку.

— Да якога слоўніка вы звярталіся, каб удакладніць значэнне слоў?

— Якія словы ў скорагаворках запісаны з вялікай літары? Чаму?

Праводзіцца ўзаемаправерка выкананага пісьмовага задання.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Вучні чытаюць праблемную сітуацыю на с. 94 вучэбнага дапаможніка; выказваюць сваё меркаванні адносна таго, колькі значэнняў могуць мець словы.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік прапануе вучням самастойна сфармуляваць тэму і мэты ўрока.

***Практыкаванне 125.***

Вучні называюць прадметы, адлюстраваныя на малюнках; вызначаюць словы, якія маюць некалькі значэнняў, і самастойна запісваюць іх у сшытках. *(Конь, ручка.)*

— Ці можаце вы зрабіць вывад, колькі значэнняў можа мець слова?

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 95) і вызначаюць, ці правільны вывад яны зрабілі.

***Практыкаванне 126.***

Вучні чытаюць загадку, называюць адгадку — цягнік.

— Пра які хвост ідзе размова ў загадцы? *(Пра хвост цягніка.)* Назавіце значэнні слова *хвост* з апорай на малюнкі ў вучэбным дапаможніку.

Настаўнік прапануе пераканацца ў правільнасці разважанняў і ўдакладніць значэнні слова *хвост* па тлумачальным слоўніку. Пры гэтым акцэнтуецца ўвага на асаблівасцях афармлення мнагазначных слоў у слоўніку.

Вучні складаюць сказы са словам *хвост* у розных значэннях. Знаходзяць у загадцы словы з супрацьлеглым значэннем. *(Днём — ноччу, быў — знік.)*

Тлумачэнне правапісу выдзеленых літар у словах праводзіцца франтальна. Узор тлумачэння: «Вымаўляю слова — [ночу]. У слове падоўжаны гук [ч]. На пісьме ён перадаецца дзвюма літарамі **ч**».

Кожны вучань самастойна запісвае першы сказ і слова-адгадку.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 127.***

Праца па ўстанаўленні адпаведнасці паміж устойлівымі выразамі і іх значэннямі праводзіцца франтальна. *(Вадзіць за нос — уводзіць у зман,*

*не паказваць вачэй — не прыходзіць куды-небудзь, не выходзіць з галавы — не забываецца.)*

— Прывядзіце прыклады жыццёвых сітуацый, у якіх можна ўжываць гэтыя выразы.

Вучні тлумачаць правапіс прапушчаных літар у словах і запісваюць устойлівыя выразы з гэтымі словамі. Выкананне задання арганізуецца каля дошкі і ў сшытках.

***Практыкаванне 128.***

Настаўнік прапануе вучням прачытаць назву тэксту і спрагназаваць, пра што можа ісці гаворка ў ім.

Вучні чытаюць тэкст, расказваюць, пра які від транспарту ў ім паведамляецца, у чым яго асаблівасць; выказваюць свае думкі адносна таго, ці зручна было карыстацца такім транспартным сродкам.

Вучні знаходзяць назвы транспартных сродкаў у тэксце і запісваюць іх у алфавітным парадку. *(Аўтобус, конка, маршрутка, метро, тралейбус, трамвай.)* Запіс слоў праводзіцца з каменціраваннем.

— Якія з запісаных відаў транспартных сродкаў ёсць у нашым населеным пункце (горадзе, аграгарадку, пасёлку, вёсцы)? На якім транспартным сродку вам хацелася б праехаць? Якія правілы бяспечных паводзін у грамадскім транспарце трэба ведаць і выконваць?

— Колькі значэнняў маюць словы, якія вы запісалі? Да якога слоўніка трэба звярнуцца, каб удакладніць значэнне слоў?

Вучні высвятляюць значэнне запісаных слоў і слова *рэйка* па тлумачальным слоўніку. Робяць вывад, што толькі слова *рэйка* мае тры значэнні, астатнія словы — адно.

***Самастойнае выкананне задання на картках.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем.

> Каб паказаць розныя значэнні аднаго і таго ж слова, Саша падабраў некалькі малюнкаў.
>
> 
>
> Значэнне якога слова хацеў паказаць хлопчык? Запішыце адказ. __________
> Складзіце і запішыце сказ пра прыладу для шыцця.
> ______________________________________________

Праверка задання ажыццяўляецца настаўнікам самастойна.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 97, практ. 129. Настаўнік тлумачыць, што сказы трэба запісаць у слупок.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Ці згодныя вы са сцвярджэннем: «Кожнае слова ў беларускай мове мае толькі адно значэнне»? Адказ аргументуйце.

— Якія словы, што маюць некалькі значэнняў, вы запомнілі на ўроку?

## Урок 71. Словы з блізкім значэннем. Кантрольны слоўнікавы дыктант

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уяўленне пра словы з блізкім або аднолькавым значэннем, развіваць уменне вызначаць такія словы сярод прапанаваных слоў і ў тэксце; развіваць уменне самастойна падбіраць словы, блізкія па значэнні, да прапанаваных слоў, тлумачыць значэнне слоў; удасканальваць уменне тлумачыць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі на вывучаныя правілы; узбагачаць слоўнікавы запас; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да прыроды; праверыць сфарміраванасць навыку правапісу слоўнікавых слоў.

***Абсталяванне:*** энцыклапедыя пра жывёл; тлумачальны слоўнік; малюнкі (фотаздымкі), на якіх адлюстраваны птушка аўсянка, грыбы сыраежкі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап правядзення кантрольнага слоўнікавага дыктанта*.**

Кантрольны слоўнікавы дыктант выконваецца ў сшытках для кантрольных работ. Вучні запісваюць дату, від работы не ўказваюць.

Перад пачаткам дыктанта настаўнік прапануе адгарнуць форзац вучэбнага дапаможніка і паўтарыць ужо засвоеныя слоўнікавыя словы.

Настаўнік дыктуе выбраныя 7 слоў, а вучні запісваюць іх з чырвонага радка праз коску. Пасля запісу ўсіх слоў вучням даецца час на самаправерку.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Вучні чытаюць праблемную сітуацыю на с. 97 вучэбнага дапаможніка. На ўрок настаўнік можа прынесці ілюстраваную энцыклапедыю пра жывёл і прапанаваць разгледзець старонку, на якой прадстаўлена інфармацыя пра гіпапатама. З апорай на інфармацыю і ілюстрацыі з энцыклапедыі, раней набытыя веды вучні абмяркоўваюць магчымы адказ дзядулі і фармулююць адказ на пытанне «Ці ёсць у беларускай мове словы, блізкія або аднолькавыя па значэнні?».

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Вучні фармулююць тэму і мэты ўрока. Настаўнік пры неабходнасці ўдакладняе, дапаўняе адказ вучняў.

***Практыкаванне 130.***

Выкананне задання праводзіцца франтальна. Вучні вызначаюць, што кожны малюнак можна падпісаць рознымі словамі, якія маюць аднолькавае значэнне. *(Лётчык, пілот. Алфавіт, азбука. Дарога, шаша.)* Вучань, які першы правільна вызначае словы для пэўнага малюнка, запісвае іх на дошцы.

* Згодна з Дадаткам 3 да Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, кантрольны слоўнікавы дыктант у ІІ паўгоддзі павінен складацца з 7 слоў.

Астатнія фіксуюць словы ў сшытках. Такім чынам арганізуецца праца з кожным малюнкам.

— Што такое алфавіт? Чаму яго неабходна ведаць?

Вучні ўспамінаюць алфавіт: па ланцужку называюць літары.

Настаўнік прапануе вучням удакладніць значэнне слова *шаша* па тлумачальным слоўніку.

Завяршаецца выкананне практыкавання адказамі вучняў на пытанні:

— Колькі слоў вы выкарысталі, каб падпісаць адзін і той жа малюнак? Які вывад пра значэнне слоў вы можаце зрабіць?

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 98) і вызначаюць, ці правільны вывад яны зрабілі.

***Практыкаванне 131.***

Спачатку вучні чытаюць тэкст самастойна, а затым — па ролях, расказваюць, што выклікала ў іх усмешку.

Вучні тлумачаць значэнне слоў *ідзе*, *крапае* (пры неабходнасці звяртаюцца да тлумачанага слоўніка), робяць вывад, што гэтыя словы блізкія па значэнні. Кожны вучань самастойна запісвае іх у сшытак. Дадаткова настаўнік можа прапанаваць заданне:

— Якое яшчэ слова, блізкае па значэнні да слова *ідзе*, можна падабраць? *(Лье.)* Якая розніца ў значэнні слоў *крапае* і *лье*?

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 132.***

Кожны вучань вызначае, заданне «пілота» ці «касманаўта» будзе выконваць.

Затым выкананне практыкавання можна арганізаваць па-рознаму з улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў.

Варыянт 1. Кожны вучань самастойна аб'ядноўвае ў пары словы, блізкія па значэнні, запісвае іх. Праводзіцца франтальная праверка.

Варыянт 2. Адзін «пілот» і адзін «касманаўт» выконваюць заданне на дошцы, а астатнія вучні — у сшытках. Затым праводзіцца праверка: вучні, якія выконвалі заданне каля дошкі, каменціруюць свой запіс.

Варыянт 3. «Пілоты» і «касманаўты» аб'ядноўваюцца ў групы, абмяркоўваюць пары слоў, блізкія па значэнні. Настаўнік правярае правільнасць выканання задання. Пасля чаго кожны вучань самастойна запісвае словы ў сшытак.

Варыянт 4. Спачатку праводзіцца франтальнае выкананне задання: вусна выконваецца заданне «пілотаў» ці «касманаўтаў». Затым кожны вучань самастойна запісвае словы ў сшытак.

***Практыкаванне 133.***

— Успомніце, што такое тэма тэксту і асноўная думка тэксту.

Пасля чытання тэксту вучні вызначаюць яго тэму і асноўную думку; расказваюць, як дождж і сыраежка дапамаглі жывёлам. Настаўнік цікавіцца, ці ведаюць вучні, як выглядае сыраежка, паказвае фотаздымкі (малюнкі) з сыраежкай, прапануе вучням апісаць, як выглядае гэты грыб, і паразважаць, ці магла адбыцца сапраўды такая сітуацыя ў прыродзе.

Франтальна праводзіцца праца па тлумачэнні правапісу слоў з прапушчанымі літарамі. *(Сапраўдны, напоўнілася, захацеў, лужыну, лавіць, убачыла, памачыла.)*

Звяртаецца ўвага на слова-амонім — *аўсянка*. Вучні знаходзяць і чытаюць сказ са словам *аўсянка*, тлумачаць значэнне гэтага слова з апорай на кантэкст. *(Гэта назва птушкі.)* Настаўнік дэманструе малюнак (фотаздымак), на якім адлюстравана аўсянка. Вучні прыгадваюць, што аўсянкай называюць яшчэ аўсяныя крупы.

Вучні знаходзяць словы, блізкія па значэнні, у першым сказе. *(Дождж, лівень.)* Звяртаецца ўвага на тое, што лівень — гэта моцны дождж. Вучні могуць удакладніць значэнне слова па тлумачальным слоўніку.

Пры наяўнасці часу можна прапанаваць пераказаць тэкст. Перад гэтым вучні перачытваюць тэкст яшчэ раз, вызначаюць, колькі ў ім частак, пра што расказваецца ў кожнай частцы.

Праца па падборы слоў, блізкіх па значэнні, да выдзеленых слоў, праводзіцца франтальна. Выкананне задання арганізуецца на дошцы і ў сшытках. *(Напаткаў, сустрэў. Памчаў, пабег. Апусцілася, знізілася, села.)*

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 100, практ. 134. Настаўнік тлумачыць, што пры спісванні верша слова *расінкі-ліхтарыкі* трэба «падняць» на папярэдні радок. Звяртаецца ўвага на тое, што ў першым сказе трэба падкрэсліць словы, якія абазначаюць, пра што ў ім гаворыцца і што пра гэта гаворыцца.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Прывядзіце прыклады слоў, якія маюць аднолькавае або блізкае значэнне.

## Урок 72. Словы з супрацьлеглым значэннем

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уяўленне пра словы з супрацьлеглым значэннем, развіваць уменне вызначаць такія словы сярод прапанаваных слоў і ў тэксце; развіваць уменне самастойна падбіраць словы, супрацьлеглыя па значэнні, да прапанаваных слоў, тлумачыць значэнне слоў; удасканальваць уменне тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы; узбагачаць слоўнікавы запас; пазнаёміць са слоўнікавымі словамі *стадыён, цвёрды*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** малюнкі для рэбуса — дыня, лён;

карткі з заданнем для работы ў парах.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 134.***

Вучні чытаюць верш, называюць сказ, якім можна падпісаць малюнак (першы сказ), называюць